# Пісьменнік-франтавік Алесь Савіцкі пакінуў аўтограф на Рэйхстагу

## Да векавога юбілею слыннага беларускага пісьменніка, партызана, франтавіка Алеся Ануфрыевіча Савіцкага

УДК 929:355.123.3+070+821.161.3



**Таццяна ПАДАЛЯК,**
**доктар філалагічных навук, дацэнт**

Таццяна ПАДАЛЯК. Пісьменнік-франтавік Алесь Савіцкі пакінуў аўтограф на Рэйхстагу. Аналізуецца пісьменніцкая і журналісцкая спадчына вядомага беларускага пісьменніка, партызана і франтавіка Алеся Савіцкага. Удакладняюцца старонкі біяграфіі, грамадзянская пазіцыя пісьменніка адносна фальсіфікацый гісторыі, актуалізуецца тэма сацыяльнай адказнасці журналіста і пісьменніка перад будучымі пакаленнямі. Артыкул прымеркаваны да 100-годдзя пісьменніка.

Ключавыя словы: Вялікая Айчынная вайна, партызанскі рух, падпольны друк, фальсіфікацыя гісторыі, сацыяльная памяць, журналістыка, мастацкая літаратура.

Tatsiana PADALIAK. Writer at war Ales Savitsky leaves his autograph on the Reichstag. The article analyzes literary and journalistic legacy of the famous Belarusian writer, partisan and front-line fighter Ales Savitsky. The article specifies some biographical facts and highlights his civil position regarding the falsification of history. It also raises the topic of social responsibility of a journalist and a writer to future generations. The article is dedicated to the 100th anniversary of the birth of the writer.

Keywords: Great Patriotic War, partisan movement, underground printing, falsification of history, social memory, journalism, fiction.

Біяграфія гэтага ўнікальнага чалавека сама па сабе нібыта легенда: партызан – франтавік – журналіст – пісьменнік…

Прыпісаў сабе год, каб трапіць у партызаны. На яго рахунку шмат падарваных эшалонаў, спаленых і ўзарваных мастоў. Тройчы паранены.

Ордэн Славы ІІІ ступені знайшоў яго праз паўвека пасля заканчэння вайны.

Які лёс!.. Не будзе перабольшаннем сцвярджаць, што яго жыццё – сюжэт для захапляльнага серыяла.

Мы часта стэлефаноўваліся, сустракаліся ў Доме прэсы і на факультэце журналістыкі БДУ, на прэзентацыях кніг у бібліятэках, разам наведвалі яго сяброў-партызан у Рэспубліканскім інтэрнаце ветэранаў вайны і працы ў Ждановічах. Абмяркоўвалі самыя розныя тэмы: літаратурныя, жыццёвыя, будзённыя. І ўсё ж найчасцей размаўлялі пра Другую сусветную вайну: аналізавалі, чаму некаторым так карціць перапісаць гісторыю. Гэты артыкул у многім пабудаваны на фрагментах шматлікіх гутарак з пісьменнікам. Алесь Ануфрыевіч Савіцкі нарадзіўся ў Полацку. Юнацтва, па сутнасці, не было: у 1942 годзе стаў партызанам атрада «Смерць фашызму», пазней – камандзірам падрыўной групы атрада «Бальшавік» брыгады імя Варашылава. У 1944–1945 гадах – у дзеючай арміі, удзельнічаў у вызваленні Варшавы і Гдыні, у баях за ўзяцце Берліна. Пасля дэмабілізацыі працаваў у рэдакцыі полацкай газеты «Бальшавіцкі сцяг». У 1958-м скончыў Літаратурны інстытут імя Горкага ў Маскве і аспірантуру. Аўтар кніг «Кедры глядзяць на мора», «Жанчыны», «Палын – зелле горкае», «Самы высокі паверх», «І нічога ўзамен», «Зямля не раскажа», «Літасці не чакай», «Памерці заўсёды паспееш», «Обаль», «Пісьмо ў Рай» ды іншых.

## «Састарыў» сябе, каб стаць партызанам



Алесь Савіцкі. 1983 год

Яго сапраўдны год нараджэння адрозніваецца ад афіцыйнага, занатаванага ва ўсіх энцыклапедыях: 8 студзеня 1924 года. Прызнаваўся:

– Насамрэч я з 1925-га. Перад вайной скончыў 8 класаў. У партызанах прыпісаў сабе год, адтуль і пайшло… Я быў у падрыўной групе Няфёдава атрада «Смерць фашызму», якім кіраваў тады палкоўнік Жараў. Гэта яго партызанскі псеўданім. А сапраўднае прозвішча – Пётр Кісялёў.

«Зімою сорак другога мяне параніла. Разам з Сяргеем Зімніцкім мы мініравалі чыгунку ў сасновым бары паміж Полацкам і Фарынава. Міну – амаль дваццаць кілаграмаў толу, выплаўленага з артылерыйскіх снарадаў, – паставілі, але адбегчыся далёка не паспелі: цяжка было адольваць завалы з таўшчэзных сснаў, апплеценых дротам і закіданых снегам. Выбуху не чуў; памятаю вялізнае, на ўсё неба, малінава-белае сонца і ціхі, вельмі ціхі і прыгожы гул, як бомканне маленькіх званоў… Выратаваў мяне Сяргей. Ён першы апрытомнеў, доўга поўзаў па снегавых гурбах, але мяне знайшоў і пацягнуў да лесу. Потым я апрытомнеў таксама і папоўз сам» («Пад роднымі клёнамі») *[1, с. 26]*.

У 1943 годзе 20 камсамольцаў атрада «Смерць фашызму» паслалі на арганізацыю новага камсамольска-маладзёжнага атрада «Бальшавік». Савіцкага прызначылі камандзірам падрыўной групы. І так да злучэння з арміяй.

З баявой характарыстыкі камандзіра дыверсійнай групы партызанскага атрада «Бальшавік» брыгады імя Варашылава Аляксандра Ануфрыевіча Савіцкага за подпісам камандзіра партызанскага атрада «Смерць фашызму» Слаўскага і камісара атрада «Бальшавік» Пячонкіна ад 12 кастрычніка 1944 года: «Тов. Савицкий А.А., уроженец города Полоцка Витебской области БССР. До войны был учащимся средней школы г. Полоцка. При оккупации г. Полоцка фашистскими извергами и организации в этом районе ещё первичных групп партизанского движения молодой юноша, тов. Савицкий А.А., оставляет свою родную мать и идет в ряды народных мстителей. Вступив в ноябре 1942 года в отряд „Смерть фашизму“, тов. Савицкий вступает добровольно в диверсионную

### ПРА АЎТАРА

ПАДАЛЯК Таццяна Уладзіміраўна.

Нарадзілася ў г. Мінску. Скончыла факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1986), аспірантуру БДУ (1992), дактарантуру БДУ (2015).

Працавала ў раённым, шматтыражным друку, з верасня 1991 года – выкладчык, старшы выкладчык, з лютага 1999 года – дацэнт факультэта журналістыкі БДУ. У 1992–2009 і ў 2011–2012 гадах – у газеце "Звязда": карэспандэнт, рэдактар аддзела культуры, намеснік галоўнага рэдактара. У 2009–2011 гадах – намеснік дырэктара па інфармацыйнай рабоце РУП «Дом прэсы», кіраўнік прэс-цэнтра. З 2015 года – дацэнт кафедры тэорыі і метадалогіі журналістыкі (з 2019 года – кафедра медыялогіі), з 2020 года – прафесар кафедры медыялогіі факультэта журналістыкі БДУ.

Доктар філалагічных навук (2019), дацэнт (2004).

Аўтар больш як 150 навуковых работ, дзвюх манаграфій, двух вучэбна-метадычных дапаможнікаў, чатырох дакументальна-публіцыстычных кніг.

Сфера навуковых інтарэсаў: тэорыя і метадалогія журналістыкі, прафесійная этыка журналіста, уздзеянне прэсы на фарміраванне аксіялагічных прыярытэтаў аўдыторыі СМІ.

группу партизанского отряда для того, чтобы как можно больше отомстить оккупантам за те ужасы зверств, которые были нанесены белорусскому народу… За период с ноября 1942 по июль 1943 года в партизанском отряде „Смерть фашизму“ тов. Савицкий имеет на своем боевом счету: спущенных под откос вражеских эшелонов с живой силой и техникой – четыре эшелона, подорваны на противотанковых минах – три вражеских автомашины с живой силой, тов. Савицким лично были подорваны толом 5 шоссейных мостов и 2 железнодорожных моста, на линии Полоцк – Молодечно, тов. Савицким лично было уничтожено 27 немецких солдат и офицеров. За эти подвиги командование отряда „Смерть фашизму“ тов. Савицкого А.А. дважды представило к правительственной награде. В июле 1943 года организовывается новый отряд этой же бригады – „Большевик“. Тов. Савицкий А.А. как имеющий большой практический опыт по диверсионной деятельности с первых же дней организации отряда назначается командиром диверсионной группы в количестве 5 человек. За короткое время, т. е. за 4 месяца, тов. Савицкий вырастил группу в 18 человек. <…> Указом Верховного Совета СССР тов. Савицкий уже награжден дважды: орденом Красной Звезды и медалью „Партизану Отечественной войны“ I степени. Тов. Савицкий скромный воин, никогда не кичится своими успехами, имел широкий авторитет среди партизанских масс не только нашей бригады, но и всего партизанского движения Белоруссии, его боевые подвиги не раз обсуждались и изучались на партизанских собраниях. На его боевых примерах учились многие партизаны, как надо бить врага» *[1, с. 13–16]*.

## «Стагнала ад болю зямелька беларуская»

– Я прайшоў «партызанку» з 1942 года і абсалютна перакананы, што такой яскравай старонкі ў жыцці беларускай зямлі не было – калі паўстаў увесь народ, ад мала да вяліка. Так, шмат разоў бяда засявала сваім чорным насеннем наш край і стагнала ад болю зямелька беларуская. За стагоддзі, што сплылі ў нябыт, ваеннага ліхалецця пранеслася над нашай Бацькаўшчынай нямала, але такога жаху яшчэ не было… На дзюралевай спражцы рэменя кожнага салдата вермахта быў надпіс: «З намі Бог». Сп'янелыя ад лёгкіх перамог над краінамі Еўропы, выдатна ўзброеныя нямецкія салдаты верылі ў гэта. Але Бог быў не з тымі, хто заліваў зямлю крывёю жанчын і дзяцей, хто рабаваў і паліў гарады і вёскі. Бог быў на баку тых, хто бараніў сваю Бацькаўшчыну. Такой мужнасці – мужнасці не асобнага чалавека, а ўсяго народа! – гісторыя Беларусі не ведала. І калі сёння той-сёй спрабуе абылгаць, апляваць гераічную старонку зямлі і народа – уся мая партызанская сутнасць устае супраць гэтага.

## «Арыя абалваньвання»: прапісана ў дактрыне

Ён неаднаразова гаварыў пра тое, што асабліва непакоіла: згадваў пасляваенную дактрыну Алена Далеса, часта цытаваў яго прароцтвы: «Скончыцца Другая сусветная вайна. Нейкім чынам усё ўтрасецца, уладкуецца. І мы кінем усё, што маем, усё золата, усю матэрыяльную моц і рэсурсы на адурачванне і абалваньванне людзей… Пасеяўшы там хаос, мы непрыкметна падменім іх каштоўнасці на фальшывыя і прымусім іх у гэтыя фальшывыя каштоўнасці верыць. Мы знойдзем сваіх аднадумцаў, сваіх саюзнікаў і памочнікаў у самой Расіі. Эпізод за эпізодам будзе разыгрывацца грандыёзная трагедыя гібелі самага непакорлівага на зямлі народа, канчатковага згасання яго самасвядомасці. З літаратуры і мастацтва мы паступова вытравім сацыяльную сутнасць, адвучым, адаб'ем у іх ахвоту займацца выяўленнем, даследаваннем тых працэсаў, якія адбываюцца ў глыбінях народных мас. Літаратура, тэатр, кіно – усё будзе адлюстроўваць і ўслаўляць самыя нізменныя чалавечыя пачуцці. Мы будзем усяляк падтрымліваць і ўзнімаць так званых мастакоў, якія стануць укараняць і ўдалбліваць у чалавечую свядомасць культ сексу, насілля, садызму, здрады – словам, усякай амаральнасці. У кіраванні дзяржавай мы створым хаос, блытаніну. Мы будзем непрыкметна, але актыўна і пастаянна спрыяць самадурству чыноўнікаў, хабарнікаў, беспрынцыповасці. Сумленнасць і прыстойнасць будуць абсмейвацца і нікому не стануць патрэбныя, ператворацца ў перажытак мінулага. Хамства і нахабства,

хлусня і падман, п’янства і наркаманія, жывёльны страх і бессаромнасць, здрадніцтва, нацыяналізм і варожасць народаў, перш за ўсё варожасць і нянавісць да рускага народа – усё гэта мы будзем спрытна і непрыкметна культываваць. І толькі нямногія, вельмі нямногія будуць здагадвацца або нават разумець, што адбываецца на самай справе. Але такіх людзей мы паставім у бездапаможнае становішча, ператворым у пасмешышча, знойдзем спосаб іх абылгаць і абвясціць адкідамі грамадства. Мы будзем расхістваць пакаленне за пакаленнем…»


У Германіі. 1945 год

Алесь Ануфрыевіч быў перакананы: тое, што адбываецца з аплёўваннем гісторыі, і ёсць ажыццяўленне дактрыны Алена Далеса: «Неяк на сустрэчы з мінскімі студэнтамі-першакурснікамі, будучымі настаўнікамі, я спытаў у даволі шматлікай аўдыторыі: ці ведае хто-небудзь імя і прозвішча ленінградскай школьніцы, Героя Савецкага Саюза, якая ўлетку 1941-га прыехала на Віцебшчыну да бабулі ў вёску ля станцыі Обаль, актыўна ўдзельнічала ў камсамольска-маладзёжным падполлі, гераічна загінула ад рук фашысцкіх катаў. На вялікі жаль, не адказаў ніхто. Сумнае і горкае гэта маўчанне. А яго не павінна быць» *[2]*.

Будучым настаўнікам пісьменнік задаваў пытанне пра Зіну Партнову (1926–1944), члена падпольнай камсамольска-маладзёжнай арганізацыі «Юныя мсціўцы». Раман «Обаль» ён прысвяціў «юным змагарам Прыдзвіння, якія загінулі ў барацьбе за волю сваёй Бацькаўшчыны» *[3, с. 3]*.

На думку Алеся Савіцкага, фэйкі пра гісторыю Беларусі, яе мужную старонку змагання з акупантам добра разлічаны, прычым у гэтым прасочваецца пэўная планамернасць і заканамернасць:

– Фальсіфікуецца гісторыя вайны, апраўдваюцца-абяляюцца гітлераўскія прыхвасні. А што робіцца ў Эстоніі, Латвіі, ва Украіне… На жаль, і ў Беларусі не абыходзіцца без мярзотнасці. Адна так званая незалежная (ідаць, ад праўды?) газета надрукавала матэрыял пад загалоўкам «Сытый партизан – голодный народ». Знайшлі чалавека, які расказвае: партызаны былі сытыя, бо забралі ў народа ўсё. Потым яшчэ ганебная публікацыя – пра ролю жанчыны ў партызанскім руху… Выхопліваюць па-за кантэкстам асобныя «факцікі» і на іх падставе спрабуюць перапісаць гісторыю.

## Партызанскі хлеб

Алесь Ануфрыевіч паказаў дакумент ад 1 красавіка 1943 года, дзе сакратар Ветрынскага райкама партыі Цябут дае звесткі аб правядзенні веснавога севу 1943 года: «1. Зямлю размеркаваць сярод усіх сялян, уключаючы кожнага члена сям’і, які знаходзіцца ў Чырвонай Арміі ці партызанскім атрадзе, выдаўшы ўсім камуністам, камсамольцам і савецкім работнікам, якія былі пазбаўлены зямлі нямецкімі акупацыйнымі ўладамі, з разліку: ад 15 і старэйшым мужчынам і жанчынам па норме, ніжэй 14 гадоў на кожнага па 0,5 нормы.

2. Дазволіць рабочым саўгаса «Банонь» праводзіць сяўбу аднаасобна.

3. Даручыць камісарам атрадаў і інструктару РК КП(б)Б правесці сход стараст вёсак па пытанні веснавога севу і тлумачэння аб карыстанні зямлёю, мабілізаваўшы ўсіх сялян на поўны пасеў…»

– Вось што было! – усхвалявана гаварыў пісьменнік. – На той час Беларусь яшчэ была акупаваная гітлераўскай Германіяй. Партызаны адваявалі ў нямецка-фашысцкіх захопнікаў землі ад Полацка да Лепеля і яшчэ далей: у партызанскай зоне была сапраўдная савецкая ўлада. Працавалі школы. На веснавы сеў партызаны кідалі ўсе сілы на дапамогу вёсцы. Сеялі, а потым і дапамагалі сабраць ураджай. Вось як здабываўся партызанскі хлеб! Пра гэта мая аповесць «Узаранае поле». Прывяду яшчэ адзін дакумент з далёкага 1943 года. У Нацыянальным архіве

захоўваецца Палітданясенне Віцебскаму абкаму КПБ камісара брыгады імя Варашылава таварыша В.А. Лемзы ад 30 верасня 1943 года: «Аказана дапамога насельніцтву, пацярпеламу ад нямецкіх акупантаў. Выдадзена жыта – 215 коп, змолатага – 12 пудоў, гароху – 10 вазоў. Раздадзена ў часовае карыстанне 88 кароў, беззваротна – 12 коней. Гэтым аблегчылі становішча 158 пацярпелых гаспадарак…» Усё пералічанае было адбіта ў нямецкіх гаспадарак і раздадзена па вёсках людзям, якія засталіся без нічога. Дык гэта данясенне за месяц толькі адной партызанскай брыгады. А колькі іх было на ўсёй Беларусі!



**Журналісты Алесь Савіцкі (злева) і Рыгор Голанд каля рэдакцыі газеты «Бальшавіцкі сцяг». 1946 год**

## «Калі льюць бруд на жанчын, якія ваявалі, ува мне ўсё пратэстуе»

– У нашым атрадзе было дзве медсястры – Каця Канцыял і Каця Несан, – расказваў А. Савіцкі. – А што такое партызанскі санінструктар? Гэта палявы шпіталь, які месціцца ў звычайнай сумачцы, перакінутай праз плячо. Гэта ўжо потым, у 1943 годзе, калі ў ворага былі адваяваны велізарныя тэрыторыі, працавалі партызанскія шпіталі, кожную ноч садзіліся самалёты на партызанскія аэрадромы, вывозілі параненых на «вялікую зямлю»… Помню, Івану Лемешу ў баі прастрэлілі нагу разрыўной куляй, і ноччу якраз сеў самалёт. Хлопца вывезлі, уратавалі жыццё. Пасля вайны ён вярнуўся ў Полацк, працаваў у журналістыцы. Дажыў да 82 гадоў. Напрыканцы вайны меддапамога была больш-менш наладжана, а напачатку ўсё гэта клалася на плечы дзвюх маладзенькіх дзяўчат. Каця Несан загінула пры прарыве страшнай блакады летам 1944-га, непадалёк ад Ушач. Яна была паранена – і прасіла адно: пакінуць ёй пару гранат.

**– І партызаны пакінулі яе, параненую, з гранатамі? –** спытала пісьменніка.

– Так. Брыгада ішла на прарыў, разумееце?.. Была страшная калатнеча, там загінула вельмі многа людзей. І аператар Марыя Сухава, якая здымала прарыў, таксама геранічна загінула. Калі льюць бруд на жанчын, якія ваявалі, – ува мне ўсё пратэстуе. Бо гэта з той жа «арыі абалваньвання». Як і хлусня пра партызан-забойцаў. Немцы стваралі лжэпартызанскія атрады – вы думаеце, гэта проста так было зроблена? У лжэпартызанскіх атрадах былі здраднікі, вышкаленыя галаварэзы, адпетыя бандзюгі, ворагі Беларусі – выдатна падрыхтаваныя, вымуштраваныя, вельмі добра ўзброеныя. І самае страшнае – што яны былі забяспечаны бездакорнымі дакументамі. У адной з вёсак, помню, расказвалі, што адбывалася напярэдадні: 12 чалавек у савецкай вайсковай форме рабавалі, гвалтавалі, што толькі не вытваралі. Гэта варожая спецгрупа пакінула крывавы след. Падобных ілжэпартызанаў было нямала. І з імі цяжка было змагацца. Будзем прама гаварыць: рыхтавалі падобныя правакацыі не дурныя людзі. Іх мэта перш за ўсё прапагандысцкая: зняславіць партызанскую вайну. Гаварыць пра нейкае марадзёрства, напрыклад, у зоне нашай брыгады (Полаччына) проста смешна: там кожная вёска навідавоку, у кожным населеным пункце – падпольныя групы. А з якой нянавісцю ставіўся народ да нямецкіх памагатых. Нашыўка паліцэйскага на рукаве – гэта прысуд.

## Ордэн Славы знайшоўся праз… 55 гадоў

Калісьці спытала Алеся Ануфрыевіча: дзе больш складана было – у партызанах ці ў дзеючай арміі?

– Пры ўсіх страхоццях ваеннага франтавога жыцця ўсё-такі там было лягчэй. Бо ты адчуваў, што за тваёй спінай – франтавы шпіталь, магутнасць арміі. Пасля злучэння з часцямі Чырвонай арміі мы, партызанская

моладзь, папоўнілі 3-і механізаваны Сталінградскі танкавы корпус. Я трапіў у 9-ю гвардзейскую брыгаду дэсантнікаў. Дайшлі да Шаўляя, там увосень 1944-га была такая страшная калатнеча… Мяне параніла – трэці раз за вайну (да гэтага два разы ў партызанах). Пасля шпіталю ў Арэнбургу трапіў на фронт ужо пад зімовае наступленне: Варшава, Гдыня… Вайну скончыў у Берліне.

**– Алесь Ануфрыевіч, вы сапраўды пакінулі аўтограф на Рэйхстагу, ці гэта метафара?**

– Ну, якая метафара?! Сапраўды – распісаўся. У мяне ёсць медаль «За ўзяцце Берліна».

**– А партызанскія ўзнагароды?**

– У 1942 годзе атрымаў ордэн Чырвонай Зоркі. Ужо пазней былі ордэны Айчыннай вайны I ступені, «Знак Пашаны», Францыска Скарыны… Самае цікавае, што доўгі час не ведаў аб узнагародзе за баі пад Шаўляем. Прайшло 55 гадоў. Аднойчы раздаецца тэлефонны званок: «Гэта з ваенкамата. Мы знайшлі наградныя дакументы – у 1944 годзе вы былі ўзнагароджаны ордэнам Славы». Думаю: хто ж гэта з нашых хлопцаў-пісьменнікаў мяне разыгрывае? Каб падтрымаць жарт, пытаюся: «І многа нас?» У адказ: «Не, з ордэнам вы адзін. Яшчэ адзін з медалём».

**– Напраўду падумалі, што гэта розыгрыш?**

– Абсалютна! Аказалася, прыйшоў новы ваенкам, даслалі запыт у архіў – і там знайшлі дакументы аб узнагароджанні. Атрымаў ордэн Славы праз 55 гадоў, у 1999-м. Але ўсё аддаў бы, каб паўсталі адтуль, з нябыту, з магіл, усе мае хлопцы: Фёдар Кулеш, Генадзь Прылоўскі, Коля Паўлаў… Можа, свет быў бы іншым, калі б жылі тыя мільёны, якія ляглі ў зямлю. Яны, можа, напісалі б найлепшыя песні і найлепшыя кнігі; можа, яны зрабілі б адкрыцці, якія здзівілі б свет.

## «Мая куля дасталася сябру»

Перш чым стаць пісьменнікам, Алесь Савіцкі быў журналістам. Пачаў друкавацца ў 1943 годзе ў ветрынскай падпольнай газеце «Чырвоная звязда». Заметкі падпісваў «Саша С., кам. падрыўгрупы».

Алесь Ануфрыевіч пакінуў мне на памяць ксеракопію нумара 5 (791) газеты за 7 лістапада 1943 года, дзе апублікавана яго заметка «Клятва падрыўнікоў». Вось цытата: «Двое сутак група ляжала ля чыгункі, выглядаючы, дзе і калі праходзяць патрулі, дзе бываюць нямецкія засады… За кастрычнік намі ўзарвана 550 м тэлеграфнай сувязі, узарваны чыгуначны мост даўжынёю 9 м, спалена два шасейных масты, абстраляны тры эшалоны з жывой сілай, выведзена са строю два паравозы, падбіта маторная дразіна. За адзін месяц група мае на сваім рахунку 42 забітых немцы».

А самы першы твор Алеся Савіцкага быў змешчаны ў партызанскай насценгазеце:

– Я напісаў верш на смерць майго сябра Колі Паўлава. Ён шкаляр, як і я. Масквіч, пайшоў у народнае апалчэнне разам з бацькам. Сын быў кантужаны, бацька – паранены. Абодва трапілі ў палон. Бацька сканаў ад ран. Коля яго пахаваў і ўцёк з палону. Далучыўся да нашага атрада. Ён быў у маёй падрыўной групе. Аднойчы групу на заданне пад Загацце павёў не я, а Паўлаў. Бо выпаў першы снег, а ў мяне валёнкі былі не падбітыя, прамакалі… Усё сваё жыццё я жыву з думкай пра тое, што калі б я пайшоў пад Загацце ў той лістападаўскі вечар… Гэта мая куля дасталася Паўлаву, маю смерць ён узяў на сябе. Пахавалі яго ў Бабынічах. Быў сонечны дзень, уся вёска высыпала на вуліцу. Камісар атрада Іван Іванавіч Стрыкель загадаў пахаваць Колю Паўлава на кветкавай клумбе каля бальніцы. Пасля вайны яго перанеслі на пагорак, там прыгожы манумент. Тады ж мы напісалі Колевай маці – чарнавік пісьма захоўваецца ў Нацыянальным архіве. А колькі іх, такіх маладзенькіх, загінула. Якая цана заплачана за сённяшняе жыццё…

Насценгазеты – асобная старонка партызанскага руху. Вось раздзел згаданага вышэй палітданясення камісара брыгады імя Варашылава тав. В.А. Лемзы пра работу насценгазет: «Штомесячна выпускаюцца атрадныя насценгазеты (па 2 у месяц), таксама выпускаецца і насценгазета штаба брыгады. Баявыя лісткі і насценгазеты афармляюцца па-мастацку, цалкам адлюстроўваюць жыццё атрада, баявую дзейнасць атрада і асобных байцоў, якія асабліва праявілі сябе ў баі з нямецкімі акупантамі, а таксама і тых, хто парушыў ваенную дысцыпліну».

Алесь Савіцкі пакінуў і копію насценгазеты «Боевой листок» № 5 ад 4 верасня 1943 года – гэта орган партыйна-камсамольскай групы 1-га ўзвода атрада «Бальшавік». Насценгазета ўтрымлівае чатыры заметкі. Тэкст, малюнкі – усё ад рукі.

І яшчэ цікавая дэталь. Калі наведвалі баявую сяброўку пісьменніка, былую партызанку, мінёра-падрыўніка Алену Нікадзімаўну Пігулеўскую ў Рэспубліканскім інтэрнаце ветэранаў вайны і працы ў Ждановічах, Алесь Ануфрыевіч пазнаёміўся з жанчынай, якую доўгі час ведаў завочна. Былая стэнаграфістка газеты «Звязда» Ніна Іванаўна Казармшчыкава працавала ў рэдакцыі з 1946 па 1980 год. У канцы 40-х – пачатку 50-х не было ніякай тэхнікі, аператыўная інфармацыя з рэгіёнаў перадавалася па тэлефоне стэнаграфістцы. Адным з актыўных пазаштатных аўтараў «Звязды» быў полацкі журналіст Алесь Савіцкі. Яны кантактавалі па тэлефоне, а пазнаёміліся асабіста толькі праз 60 год *[4]*.



**З былой партызанкай Аленай Пігулеўскай і былой стэнаграфісткай газеты «Звязда» Нінай Казармшчыкавай у Рэспубліканскім інтэрнаце ветэранаў вайны і працы ў Ждановічах. 2012 год**

## Курган

Алесь Ануфрыевіч заўсёды ахвотна сустракаўся са школьнікамі, студэнтамі, вайскоўцамі. Тлумачыў: «Пакуль мы, ветэраны, жывыя – мы павінны расказваць. Каб моладзь ведала: за яе жыццё заплачана крывёю мільёнаў. Новыя пакаленні, як бы яны ні жылі, усё роўна шчаслівыя людзі: у іх будуць дзеці, унукі, праўнукі, каханыя жанчыны – усё будзе. А ў тых, што ляглі ў 18–20 гадоў у зямлю, абараняючы яе, – у іх нічога не будзе. Ніколі… Пакуль я жывы, буду маліцца – я, стары атэіст закажанелы! – буду прасіць Неба, каб ніколі новыя пакаленні не зведалі гэтага страхоцця, гэтай вайны, гэтай бяды».

З асаблівым задавальненнем ён гутарыў са студэнтамі факультэта журналістыкі БДУ. У 2012 годзе падчас адной з такіх сустрэч пісьменнік перадаў у медыятэку журфака свае кнігі, прыняў удзел у калектыўных чытаннях паэмы «Новая зямля», прымеркаваных да 130-годдзя Якуба Коласа. Студэнты спыталі Алеся Савіцкага пра самую любімую яго кнігу. Адказаў не задумваючыся: «Курган» Янкі Купалы. І прачытаў на памяць усю паэму! Захапленне і здзіўленне – менавіта так можна вызначыць рэакцыю студэнцкай аўдыторыі. Алесь Ануфрыевіч расказаў: «У 8 класе вывучыў гэтую паэму і ведаю дагэтуль. У партызанах аднойчы прачытаў яе хлопцам – і потым яны часта прасілі: „Шурка, чытай!“».

У самым пачатку кастрычніка 2015-га дамовіліся пра чарговую такую сустрэчу. Але 5 кастрычніка сэрца пісьменніка спынілася. Нечакана, раптоўна. У дзень, калі была запланавана сустрэча са студэнтамі, 10 кастрычніка, – праходзіла развітанне з Алесем Савіцкім *[5]*.

Ён прасіў пасля смерці прах развеяць над родным Полацкам – там, дзе Палата ўпадае ў Дзвіну. Сябра пісьменніка паэт Навум Гальпяровіч адзначаў: «Тут, на сакральным полацкім месцы, дзе вузкая вірлівая Палата ўпадае ў шырокаплынную Дзвіну, паплылі кветкі жалобы па сыне гэтай зямлі… І як зямны яго працяг стаялі тут, на Дзвінскім беразе, дачка Наталля, унук Яўген, з якімі разам мы прыехалі ў Полацк, каб выканаць апошнюю волю Алеся Савіцкага, пісьменніка, франтавіка, партызана, ганаровага грамадзяніна роднага горада» *[6]*.

Мабыць, зусім невыпадкова народны пісьменнік Беларусі Іван Пятровіч Шамякін у прадмове «Ад берагоў Дзвіны» да выбраных твораў Алеся Савіцкага (1985) пісаў пра раку, што «блізкая яго пісьменніцкаму сэрцу»:




**У час калектыўных чытанняў паэмы «Новая зямля» Якуба Коласа ў медыятэцы факультэта журналістыкі БДУ. 2012 год**

«Вобраз Дзвіны, які праходзіць амаль праз усе творы А. Савіцкага, вобраз метафарычны, абагульнены, гэта вобраз ракі жыцця, якая мае шмат паваротакаў самых незвычайных…» *[7, с. 8]*.

Пасля адыходу пісьменніка была зацверджана штогадовая літаратурная прэмія імя Алеся Савіцкага. Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч у гутарцы з намі паведаміў: «Літаратурная прэмія імя Алеся Савіцкага прысуджаецца па ініцыятыве Полацкай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы за таленавітыя творы, якія ўносяць уклад у захаванне і развіццё мастацкай літаратуры, працягваючы літаратурныя традыцыі вядомага земляка. У 2023 годзе удзел у конкурсе на саісканне прэміі бралі творцы з усёй Беларусі, было прадстаўлена больш чым сто работ. Літаратурныя традыцыі пісьменніка-патрыёта працягваюцца».

Алесь Савіцкі быў перакананы: напісана многа кніг пра вайну, але гэта толькі верхні пласт; яшчэ будуць створаны новыя кнігі, будзе па-мастацку асэнсаваная мужнасць нашага народа.

***Фота БЕЛТА, Яўгена ПЯСЕЦКАГА, з архіва аўтара***

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 05.12.2023 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Алесь Савіцкі: «Сонца на ўсіх адно»: проза, публіцыстыка / укл. Н.Я. Гальпяровіч, Н.Г. Ваніна. – Мінск: Чатыры чвэрці, 2011. – 221 с. – (Серыя «Асоба і час»).
2. Савіцкі, А.А. Старонкі календароў сягаюць у вечнасць / А.А. Савіцкі // Звязда. – 2012. – 24 сак. – С. 7.
3. Савіцкі, А.А. Обаль / Алесь Савіцкі. – Мінск: Выдавецкі дом «Звязда», 2013. – 464 с.
4. Падаляк, Т. Сустрэчы: чаканыя… нечаканасці / Т. Падаляк // Звязда. – 2012. – 13 чэрв. – С. 4.
5. Падаляк, Т. Пісьмо ў Рай / Т. Падаляк // Звязда. – 2015. – 14 лістап. – С. 10.
6. Гальпяровіч, Н.Я. Праводзіла і родная Дзвіна / Н.Я. Гальпяровіч // Звязда. – 2015. – 10 лістап. – С. 15.
7. Савіцкі, А.А. Выбраныя творы: у 2 т. / Алесь Савіцкі. – Мінск: Маст. літ., 1985. – Т. 1. Жанчына: раман; Кедры глядзяць на мора: аповесць [Прадм. І. Шамякіна]. – 472 с.